Рэспублікі Беларусь, па многіх гістарычных пытаннях неабходны цесныя і рэгулярныя навуковыя кантакты з «бліжэйшым і далёкім» замежжам. Сапраўды жабрацкім можна назваць матэрыяльнае становішча вышэйшай школы. Усё гэта вельмі трывожыць. Але ёсць галоўнае, што дазваляе захоўваць надзею, гэта — магчымасць мець уласны пункт гледжання, свабода навуковых дыскусій, адсутнасць дагматызму і навязанага зверху афіцыйнага пункту гледжання. Беларускі народ атрымаў гістарычны шанц для свабоднага развіцця. Яго немагчыма здзейсніць без дасканалага ведання свайго мінулага, без аб'ектыўнай адзнакі ролі і месца Беларусі ў міжнародным супольніцтве і сусветным гістарычным працэсе.

А. Г. БАГДАНОВІЧ

# ІДЭЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПРАГРАМАХ ЛІБЕРАЛЬНА-БУРЖУАЗНЫХ ПАРТЫЙ БЕЛАРУСІ
## (сакавік — кастрычнік 1917 г.)

Па насычанасці падзеямі 1917 г. займае асобае месца ў гісторыі барацьбы беларускага народа за нацыянальнае вызваленне, палітычную і эканамічную незалежнасць. Менавіта ў гэты час на першы план выходзіць пытанне дзяржаўнага самавызначэння беларускай нацыі, больш акрэслены выгляд набываюць уяўленні аб формах і змесце дзяржаўнасці, шляху яе дасягнення.

Палітычная атмасфера ў Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі была яшчэ больш заблытанай, чым у Расіі. Тут перапляліся ўлада Саветаў з уладамі камісараў Часовага ўрада і камітэтаў грамадскай бяспекі, што, акрамя таго, ускладнялася нямецкай акупацыяй, знаходжаннем у Магілёве стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага і барацьбой розных палітычных сіл. Справе нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння перашкаджалі таксама нізкі стан самасвядомасці беларускага насельніцтва, ігнараванне беларускага пытання з боку Расіі — Часовага ўраду і рэвалюцыйнай апазіцыі, якую ўвасабляла бальшавіцкая партыя.

Лютаўская рэвалюцыя ўнесла новы змест у беларускі рух, значна пашырыла яго сацыяльную базу. Тут, як і ва ўсіх нацыянальных рэгіёнах Расіі, пачаў складвацца памешчыцка-буржуазны блок. Грамадска-палітычныя арганізацыі гэтага блоку абаранялі інтарэсы розных пластоў беларускага грамадства, у першую чаргу — буржуазіі, часткова — памешчыкаў, заможнага сялянства, чыноўніцтва, праваслаўнага і каталіцкага духавенства. Праграмы іх мелі ліберальны накірунак, асноўныя праграмныя палажэнні былі запазычаны галоўным чынам у кадэтаў.

Наогул, канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (кадэты) была адной з найбольш масавых і ўплывовых сярод дзесяткаў партый, што дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў сакавіку — кастрычніку 1917 г. Кадэты дамінавалі ў Часовым урадзе Расіі.

Асноўныя праграмныя палажэнні партыі былі прыняты на ўстаноўчым з'ездзе ў кастрычніку 1905 г. Канчаткова зацвердзіў праграму кадэтаў другі з'езд у студзені 1906 г. Змяненні ў праграму ўносіліся на VII і VIII з'ездах партыі ў сакавіку і маі 1917 г.

Як вядома, асаблівую вастрыню нацыянальныя праблемы набылі ў гады першай сусветнай вайны. Кадэты разумелі, што нацыянальная палітыка царызму садзейнічала ўзмацненню сепаратысцкіх тэндэнцый. Разам з тым яны не маглі не ўлічваць актывізацыі вызваленчых настрояў у нацыянальных рэгіёнах краіны. У той жа час кадэты павінны былі лічыцца з міжнароднымі абставінамі, пазіцыямі ваюючых дзяржаў, якія імкнуліся выкарыстоўваць у сваіх мэтах невырашанасць нацыянальнага пытання ў Расіі. Менавіта гэтыя абставіны аказалі свой уплыў на распрацоўку кадэтамі нацыянальнай праграмы ў 1917 г.

З першых дзён вайны кадэты лічылі неабходным «захаваць нашу краіну адзінай і непадзельнай»[1]. Робячы акцэнт на ўнітарны характар дзяржаўнага ладу Расіі, яны актыўна не прымалі заклікаў да палітычнага самавызначэння народаў, федэралізму, права на тэрытарыяльную аўтаномію.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі пазіцыі кадэтаў па нацыянальнаму пытанню, па сутнасці, не змяніліся. Аб гэтым сведчаць пастановы VIII партыйнага з'езда, які адбыўся ў маі 1917 г. На з'ездзе быў заслуханы і абмеркаваны даклад вядучага тэарэтыка партыі, маскоўскага прафесара дзяржаўнага права Ф. Ф. Какошкіна «Аб аўтаноміі і правах нацыянальнасцей», унесены змяненні ў адпаведныя раздзелы праграмы. Падкрэсліваючы сваю адданасць прынцыпу захавання «адзінай і непадзельнай Расіі», дакладчык і большасць дэлегатаў з'езда выказаліся супраць дазвалення народнасцям права як палітычнага самавызначэння, так і нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. На дадзеным гістарычным адрэзку, ва ўмовах палітычнай дэстабілізацыі і ўзмацнення канфрантацыі ў міжнацыянальных адносінах, на думку кадэтаў, падзел краіны па нацыянальна-тэрытарыяльнаму прынцыпу з лагічнай непазбежнасцю прывёў бы «да поўнага разбурэння дзяржаўнага адзінства Расіі і ўсталяванню не федэрацыі (саюзнай дзяржавы), а канфедэрацыі (саюза дзяржаў)»[2]. Аптымальным рашэннем нацыянальнага пытан-

ня ў рамках поліэтнічнай дзяржавы з'явілася б наданне народнасцям не тэрытарыяльнай, а культурна-нацыянальнай аўтаноміі.

Даклад Какошкіна і прапанаваны ім праект рэзалюцыі выклікалі пярэчанне з боку кадэтаў-нацыяналаў. Прадстаўнік мінскай групы кадэтаў У. І. Самойла асцярожна выказаўся за неабходнасць развіцця прынцыпу аўтаноміі, заявіўшы, што «гутарка павінна весціся не аб абласцях-губернях, як Ферганская, Тургайская, а аб абласцях-краях». Разам з тым ён паспяшаўся заверыць, што патрабаванне абароны нацыянальных праў нярускіх народаў зусім не пагражае Расіі раздзяленнем. Насупраць, Самойла выказаў надзею, што «ў нацыянальным духу знойдуцца тыя новыя крыніцы, якія пабудуюць вялікую Расію»[3].

У выніку абмеркавання з'езд зацвердзіў асноўныя пункты даклада «Аб аўтаноміі і правах нацыянальнасцей».

Наогул, кадэты выступалі супраць магчымага ўладкавання Расіі на грунце федэрацыі. Па-першае, на думку кадэтаў, у свеце не існавала ніводнай дзяржавы-федэрацыі, пабудаванай па нацыянальнаму прынцыпу. Па-другое, для Расіі была характэрнай крайняя колькасная няроўнасць нацыянальнасцей і несуразмернасць займаемых імі тэрыторый. Таму, лічылі кадэты, план федэратыўнага будавання Расіі практычна не ажыццявімы. У якасці альтэрнатывы нацыянальнаму падзелу кадэты прапаноўвалі тэрытарыяльную аўтаномію «правінцыяльнага тыпу», з дазваленнем праў толькі ў сферы культуры. Як заявіў у дакладзе па нацыянальнаму пытанню на IX кадэцкім з'ездзе Б. Э. Нольдэ (ліпень 1917 г.), «ЦК канчаткова пастанавіў адмовіцца ад прынцыпу палітычнага самавызначэння нацый і выступаць за арганізацыю так званых нацыянальных «саюзаў», якія вырашалі б выключна нацыянальна-культурныя праблемы»[4]. Менавіта кіруючыся такімі прынцыпамі, дзейнічалі арганізацыі агульнарасійскай партыі кадэтаў на тэрыторыі Беларусі.

Як ужо зазначалася, пасля Лютага 1917 г. на Беларусі заявілі аб сваім існаванні некалькі партый ліберальна-буржуазнага накірунку. Гэтыя партыі і арганізацыі зарадзіліся і дзейнічалі ў рамках беларускага нацыянальнага руху ў якасці яго правай плыні. У той ці іншай меры прытрымліваліся ліберальнай арыентацыі наступныя беларускія партыі: Магілёўскі беларускі нацыянальны камітэт, Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі, Віцебскі саюз беларускага народа, Аршанскі беларускі народны камітэт, Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць, Беларуская партыя народных сацыялістаў і Беларуская партыя аўтанамістаў.

Магілёўскі беларускі нацыянальныя камітэт аформіўся ў канцы сакавіка 1917 г, ён аб'ядноўваў некалькі дзесяткаў чалавек, праграмы наогул не меў.

Сваю задачу Магілёўскі беларусі нацыянальны камітэт бачыў у аб'яднанні ўсяго беларускага насельніцтва ў мэтах: «а) аказання падтрымкі Часоваму ўраду ў барацьбе са знешнім ворагам і ў справе ўладкавання Расіі на пачатках дэмакратычнай рэспублікі; б) арганізацыі выбараў ва Усерасійскі Устаноўчы сход; в) распрацоўкі пытанняў, якія павінен будзе вырашыць Устаноўчы сход у згодзе з нацыянальнымі імкненнямі беларускага народу; г) эканамічнага і культурнага ўладкавання Беларусі»[5].

Саюз беларускай дэмакратыі быў утвораны на агульным сходзе ў Гомелі 18 чэрвеня 1917 г. Лідэр арганізацыі — П. В. Каранкевіч. Мэтай саюза была абвешчана «поўная лучнасць Беларусі з астатняй Расіяй, з шырокім самакіраваннем на дэмакратычных пачатках», «захаванне цэласці тэрыторыі Беларусі з горадам Вільня як галоўным яе культурным цэнтрам»[6]. Наогул, саюз прытрымліваўся ідэалогіі «заходнерусізму», выступаў супраць прызнання нават нацыянальна-культурнай адметнасці беларусаў, супраць імкненняў да краёвай аўтаноміі.

Саюз беларускага народа ўзнік у маі 1917 г. у Віцебску на сходзе мясцовай інтэлігенцыі. На гэтым сходзе быў зацверджаны Часовы камітэт з 13 членаў, старшынёй быў абраны В. Палонскі.

11 мая, на наступным сходзе, была прынята праграма Саюза беларускага народа. У ёй сцвярджалася, што Беларусь «уяўляе сабой самастойную нацыянальную велічыню», таму «яна можа дасягнуць свайго росквіту толькі пры ўмове вылучэння яе ў самастойную адміністратыўна-гаспадарчую адзінку, з пакіданнем ёй шырокага правінцыяльнага самакіравання». Для нацыянальных меншасцяў прадугледжвалася стварэнне культурна-нацыянальнай аўтаноміі. У той жа час падкрэслівалася, што Беларусь ёсць «толькі непадзельная частка адзінай Вялікай Расіі». Канчатковае ўладкаванне Беларускага краю павінен быў вызначыць Усерасійскі Устаноўчы сход[7].

У ліпені 1917 г. Віцебскі саюз беларускага народа прадставіў Часоваму ўраду праект «Аб асновах самакіравання Беларусі». Паводле праекта самакіраванне павінна было будавацца на аснове існуючых гарадскіх дум і земстваў і абмяжоўвацца толькі пытаннямі гаспадарчага характару[8].

Падобныя патрабаванні вылучаў таксама Аршанскі беларускі народны камітэт, які выступаў за адраджэнне беларускай нацыянальнасці і ўсебаковае развіццё Беларусі[9].

Улічваючы папулярнасць у масах слова «беларус», магілёўская, гомельская, віцебская і аршанская арганізацыі ўключылі яго ў сваю назву. Але гэтыя аб'яд-

нанні не ставілі сваёй мэтай усур'ёз змагацца за карэнныя сацыяльныя і нацыянальныя патрабаванні беларускага народа. Яны выступалі супраць беларускай дзяржаўнасці, не заўсёды паслядоўна прызнавалі права на культурнае самавызначэнне беларусаў.

Больш дэмакратычных поглядаў на будучае дзяржаўнае ўладкаванне прытрымліваліся Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць, Беларуская партыя народных сацыялістаў і асабліва Беларуская партыя аўтанамістаў.

Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць узнікла ў 1917 г. у Петраградзе на грунце былой Хрысціянскай злучнасці[10]. Першая партыйная праграма была выпрацавана толькі ў 1920 г.

24—25 мая 1917 г. Злучнасць арганізавала ў Мінску з'езд ксяндзоў-беларусаў. У рэзалюцыі з'езда ўздымалася патрабаванне «шырокай аўтаноміі Беларусі ў Расійскай Федэратыўнай дэмакратычнай рэспубліцы»[11].

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі завяршылася арганізацыйнае афармленне Беларускай партыі народных сацыялістаў. У кіраўніцтва партыі ўвайшлі Сушынскі, Лявіцкі, Плаўнік (З. Бядуля), Аляксюк, генералы Кандратовіч і Багдановіч. Да БПНС прымкнула і група буйных памешчыкаў на чале з Раманам Скірмунтам.

Праграма БПНС, распрацаваная ў маі 1917 г., патрабавала нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі для Беларусі «ў складзе Расійскай федэратыўна-дэмакратычнай рэспублікі з заканадаўчым органам — Беларускай Краёвай Радай», адраджэння беларускай культуры і «ўсебаковага развіцця беларускага нацыянальнага жыцця на фундаменце інтарэсаў працуючага народу», забеспячэння праў нацыянальных меншасцяў на тэрыторыі Беларусі[12].

Найбольш паслядоўна і абгрунтавана пытанні будучага дзяржаўнага ўладкавання Беларускага краю абмяркоўваліся ў праграмных дакументах аўтанамістаў. Арганізацыі Беларускай партыі аўтанамістаў узніклі вясной 1917 г. у Маскве, Петраградзе, Мінску і іншых гарадах.

У верасні 1917 г. газета «Вольная Беларусь» (орган Беларускага Нацыянальнага камітэта, пазней — Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый) надрукавала Праект платформы беларускіх аўтанамістаў, які з некаторымі дапаўненнямі быў зацверджаны партыйнай канферэнцыяй 7 верасня 1917 г.

Праект беларускіх аўтанамістаў змяшчаў наступныя патрабаванні: 1) Асновай дзяржаўнага ладу Расіі з'яўляецца дэмакратычная федэратыўная рэспубліка. 2) За беларусамі прызнаецца права на нацыянальнае, культурнае і палітычнае самавызначэнне ў межах шырокай краёвай аўтаноміі Беларусі з захаваннем адзінства і непадзельнасці яе з Расіяй і з забеспячэннем правоў нацыянальных меншасцяў краю. На чале мясцовага самакіравання павінна стаяць Рада, выбраная на грунце ўсеагульнага выбарчага права і прапарцыянальнага прадстаўніцтва нацыянальнасцей края. Вышэйшай выканаўчай уладай на Беларусі павінен стаць Генеральны сакратарыят, абраны Радай. 3) У агульнадзяржаўнай кампетэнцыі застаюцца знешняе прадстаўніцтва, ваенная арганізацыя, грошы, мытня, часткова фінансы, шляхі зносін, пошта і тэлеграф.

Для паспяховага ажыццяўлення гэтага праекту меркавалася стварыць мясцовыя камітэты, якія падпарадкоўваліся б Выканаўчаму Камітэту Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый[13].

19 кастрычніка 1917 г. «Вольная Беларусь» змясціла папраўкі да Праекта платформы беларускіх аўтанамістаў. Гэта былі канкрэтныя прапановы па рэалізацыі праекта і патрабаванні да Часовага ўраду: 1) неадкладна абвясціць дэмакратычную рэспубліку на федэральных пачатках; 2) правесці ў жыццё асновы аўтаноміі Беларусі, 3) выдаць дэкрэт аб раўнапраўі моў. Прапаноўвалася стварыць пры Часовым урадзе Раду нацыянальнасцей з прадстаўніцтвам усіх нацый, якія насяляюць Расію.

Галоўным пунктам гэтых паправак было патрабаванне «выдання Часовым урадам акту аб аўтаноміі Беларусі ў межах Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі з канчатковым далучэннем да аўтаномнай Беларусі ўсіх забраных зямель і гарадоў, ляжачых у межах этнаграфічнага рассялення беларускага народу»[14].

Праграмныя палажэнні па нацыянальнаму пытанню аўтанамістаў істотна адрозніваліся ад адпаведных палажэнняў астатніх партый ліберальнай арыентацыі. Калі апошнія свядома абмяжоўвалі вырашэнне беларускага пытання ў лепшым выпадку культурным самавызначэннем беларусаў, то аўтанамісты вялі гутарку і аб самастойным палітычным жыцці. Акрамя таго, прадстаўнікі Беларускай партыі аўтанамістаў не толькі распрацоўвалі праекты, але і імкнуліся іх рэалізаваць.

Наогул, распрацаваны ва ўмовах пачатку XX ст. ліберальны варыянт рашэння нацыянальнага пытання прадугледжваў захаванне поліэтнічнай расійскай дзяржавы. Ён быў разлічаны на кампраміс і ўзаемаразуменне паміж рознымі нацыянальнасцямі. Але рамкі абласной гаспадарчай і культурнай аўтаноміі не задавальнялі нацыянальныя рэгіёны, якія імкнуліся да дзяржаўнага самавызначэння.

Часовы ўрад рашуча выступіў супраць ідэі стварэння прыгнечанымі народамі Расіі нацыянальных дзяржаў. Так, дэлегацыю Беларускага Нацыянальнага камітэта, накіраваную ў Петраград у красавіку 1917 г., не прынялі ні старшыня

Часовага ўрада князь Львоў, ні міністр юстыцыі Керанскі. Керанскі праз чыноўніка па асобых даручэннях паведаміў, што «прыняць не можа, паколькі гэта азначала б прызнанне самастойнасці, роўнапраўя беларускага боку. Што датычыцца будучыні Беларусі, то гэта — функцыя Устаноўчага сходу»[15]. Такая пазіцыя Часовага ўрада дазваляла рэвалюцыйным партыям усяляць у народныя масы думку, што, прыйшоўшыя ў Лютым 1917 г. да ўлады лібералы ў нацыянальным пытанні прытрымліваюцца вялікадзяржаўнай палітыкі.

Імкненне да стварэння ўласнай незалежнай дзяржавы з'яўляецца найвышэйшай ступенню нацыянальнай самасвядомасці любога народа. Партыі і арганізацыі ліберальнай арыентацыі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў сакавіку — кастрычніку 1917 г., па сутнасці, выступалі супраць ідэі беларускай дзяржаўнасці. Таму невыпадкова, што іх праграмныя палажэнні па нацыянальнаму пытанню не атрымалі масавай падтрымкі і засталіся нерэалізаванымі.

[1] Милюков П. Н. Тактика фракции народнай свободы во время войны. Пг., 1916. С. 5.
[2] Воля народа. 1917. 12 мая.
[3] Вестник партии Народной Свободы. 1917. № 14—16. С. 18.
[4] Думова Н. Г. Кончилось ваше время... М., 1990. С. 198—199.
[5] Могилёвский вестник. 1917. 20 апр.
[6] Коронкевич П. В. Белорусы. Гомель, 1917. С. 10.
[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 60, воп. 3, спр. 81, арк. 13.
[8] Вольная Беларусь. 1917. 11 чэрв.
[9] НАРБ. Ф. 60, воп. 3, спр. 81, арк. 55.
[10] «Хрысціянская злучнасць» заснавана ў 1915 г. ў Заходняй Беларусі.
[11] Станкевіч А. Да гісторыі палітычнага вызвалення. Вільня, 1935. С. 87.
[12] НАРБ. Ф. 62, воп. 1, спр. 194, арк. 11.
[13] Вольная Беларусь. 1917. 17 верасня.
[14] Там жа. 19 кастр.
[15] Игнатенко И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Мн., 1986. С. 233.

Э. М. ЗАГОРУЛЬСКИЙ

# ИСТОРИЧЕСКИЕ СВЯЗИ ЗАПАДНОЙ РУСИ СО СКАНДИНАВИЕЙ

В истории Белоруссии и Скандинавии было немало периодов, отмеченных тесными историческими связями. Исследованиями доказана синстадиальность и синхронность многих процессов, протекавших в славянских и скандинавских странах.

В свете последних археологических изысканий, варяги проникают на территорию Белоруссии (исключая ее южные районы) почти одновременно со славянами. Пик их активности приходится на начало IX в. Они вступали в контакты и взаимодействие с местным населением.

Русская летопись, освещающая события этого времени, хоть и в сильно искаженном виде (они были описаны значительно позже самих событий), рассказывает об известной зависимости от скандинавов кривского (по летописи, кривичского) населения Белоруссии и соседней Смоленщины, так же как и ряда других народов северных регионов Восточной Европы (чуди, мери). Сообщается, что недовольные варяжскими поборами коренные народы, объединившись, изгнали их за море. Отсюда следует, что до этого варягам удалось установить контроль над значительной территорией Восточной Европы, включающей и какую-то часть Белоруссии.

Последующая история, связанная уже с образованием Руси и постепенным распространением ее власти на обширные пространства Восточной Евпропы, не только не исключила эти контакты, но, наоборот, еще более укрепила их, придав им новое содержание.

Период начальной древнерусской государственности был тесно связан с варягами как опытными воинами, которые составляли заметную часть древнерусского воинства.

До сих пор не ясно происхождение одного из первых властителей древнейшего в Белоруссии города Полоцка. Русская летопись, рассказывая о призвании на Русь варягов, отмечает, что Рюрик начал строить и раздавать своим мужам города «тому Полоцк, этому Ростов, другому Белоозеро»[1]. Затем уже, спустя более 100 лет, в 980 г. летопись упоминает о Рогволоде, который будто пришел из-за моря и владел Полоцком. Личность Рогволода достаточно легендарна. Большинство исследователей склонно признавать в нем варяга. Другие считают, что он был выходцем из прибалтийских славян.

Остается также невыясненным, было ли в это время Полоцкое княжение независимым государственным образованием одного из варяжских конунгов или